POLSKO-BIAŁORUSKIE ZWIĄZKI
JĘZYKOWE, LITERACKIE,
HISTORYCZNE I KULTUROWE
VI

BIAŁYSTOK 2004

ГАЛІНА ТВАРАНОВІЧ
Беласток

# ГІСТОРЫЯ ЛЮБОВІ ДА РАДЗІМЫ. АЎТАБІЯГРАФІЧНАЯ АПОВЕСЦЬ ЯНКІ ЖАМОЙЦІНА *З ПЕРАЖЫТАГА*

Літаратуру, твор, у якім можа быць змадэлявана цэласная рэчаіснасць пэўнай эпохі, паводле гэтай унікальнай пазнавальна-выяўленчай функцыі, называюць „згорнутым сусветам" (Міхаіл Салтыкоў-Шчадрын), мастацкім чалавеказнаўствам. Узаемаадносіны ж мастацтва з рэчаіснасцю – адна з найскладаных праблем эстэтыкі. Уласна, рука майстра мусіць стварыць паўнавартасны фрагмент самога жыцця, вечнага, неперарыўнага працэсу. Гэтай вялікаснай плыні, што не мае пачатку і канца, пра якую, па слушных словах Томаса Мана, немагчыма расказаць так, як яна некалі сама „расказвала" пра сябе. Так, мастацкая праўда і праўда рэчаіснасці – далёка не тоесныя паняцці. Эстэтычны элемент прыродных з'яў, успрыняты свядомасцю і апрацаваны ўяўленнямі мастака, звычайна набывае новыя абрысы, узмацняецца. І, згодна з Іпалітам Тэнам, прыгажосць, разлітая ў прыродзе, у яе формах і фарбах, знаходзіць новае, ярчэйшае выяўленне асаджаная ў межах карціны.

Свае адметныя стасункі між рэчаіснасцю і мастацкай праўдай як у кожнага віду мастацтва, так і ў кожнага літаратурнага жанру. Аднак ці не першачарговай аказваецца гэтая праблема пры асэнсаванні феномена дакументальна-мастацкай, аўтабіяграфічнай, мемуарнай прозы.

Прасторавая і часавая замкнёнасць пісьменніка ў аўтабіяграфічным творы на самім сабе не звальняе яго ад напружаных пошукаў аптымальнага ўвасаблення жыццёвай матэрыі. Ролю своеасаблівай фабулы ў творах такога кшталту адыгрывае сам чалавечы лёс з яго разнастайнымі калізіямі. Аднак разгортванне жыццёвых падзей, хай яно нават і адпавядае храналагічнаму цягу, далёка не адэкватнае сюжэту тво-



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

ра. Часава-прасторавы кантынуум тут характарызуецца асаблівым тыпам біяграфічнага часу, а таксама, па словах Міхаіла Бахціна, спецыфічна выбудаваным вобразам чалавека, „які праходзіць свой жыццёвы шлях”[1].

Янка Жамойцін, член беларускага літаратурнага аб’яднання „Белавежа” ў Польшчы, сціпла назваў сваю аўтабіяграфічную аповесць „З перажытага”.

> Мой час, пра які тут гутарка, пачаўся пад канец другога дзесятка гадоў гэтага стагоддзя, калі ў роднай старонцы на змену расейскаму рэжыму-прыгнёту прыйшоў польскі. Людзі апынуліся ў іншай дзяржаве, але гэта не займела вялікага ўплыву на іхні лёс, унутраны свет, працу ад зары да зары, іх адвечныя звычаі, турботы і ўцехі. Праўда, людзі хапілі бяды, прычыненай вайною і бежанствам ды самаволяй салдатні і бандытызмам. Край быў знішчаны, але народ, разагнаны па свеце бежанствам ці схоплены ў салдаты, вяртаўся ў свае гнёзды, каб нанава наладзіць сваё немудрагельнае бытаванне[2].

Вярнулася з бежанства і сям’я Івана Жамойціна, аднаго з 16 гаспадароў вёсачкі Клімавічы, сядзібы якой затаіліся „пасярод разлеглага балота” на Лідчыне. Неўзабаве 28 студзеня 1922 года нарадзіўся сын Янка, а пасля „больш-менш кожныя два-тры гады з’явіліся ў свет Аляксей, Андрэй, Таіса і, крыху пазней, Алег”. Паўстае са старонак аповесці воблік тыповай заходнебеларускай сям’і, уштукаванай у „цвёрды сялянскі лёс”, які „яднаў усіх вяскоўцаў у поглядах на лад і ўклад жыцця”. Вечная сялянская залежнасць ад таго, як уродзіць зямля, спрыяльнай будзе да плёну палеткаў прырода ці пакарае сушай або макрэчаю...

Ды ў гэтым, здавалася б, дарэшты прыніжаным, абяссіленым праз цяжкія ўмовы выжывання і неспрыяльныя сацыяльна-палітычныя абставіны, вясковым свеце раптам уладна заяўляе пра сябе вялікая патрэба ў культурнай, нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Нібы пэўная сям’я ці асоба аказваюцца ў надзвычай актыўнай зоне дзейнасці „рытмаў этнічнага поля” – той сілы, што Львом Гумілёвым была вызначана як пасіянарнасць. Асабліва выразныя прыклады тут дае пачатак беларускага XX стагоддзя: Коласаўская Мікалаеўшчына, Малая Багацькаўка

[1] М. М. Бахтин, *Вопросы литературы и эстэтики*, Москва 1975, с. 281.

[2] *Лёс аднаго пакалення. Успаміны*, [у:] Я. Жамойцін, *З перажытага*, Беласток 1996, с. 51. (Далей спасылкі даюцца па гэтым выданні з указаннем у тэксце ў дужках адпаведнай старонкі).



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki” Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

Гарэцкіх... У белавежскіх ваколіцах узраслі браты Георгі Валкавыцкі, заснавальнік такой асаблівай літаратурнай арганізацыі , як „Белавежа” і Мікалай Валкавыцкі, вядомы мастак. Увогуле ў спрыяльныя для беларушчыны 20-я гады ў беларускую літаратуру прыйшла цэлая кагорта таленавітых сялянскіх дзяцей. Ды пераважная большасць з іх дорага заплаціла за сваю любоў да Айчыны, за вернасць роднаму слову. Сваю ахвяру на алтар служэння Бацькаўшчыне ўсклаў і Янка Жамойцін.

Уласна, аповесць „З перажытага” сутнасцю сваёй найперш уяўляе гісторыю любові да Радзімы, гісторыю змагання за права спавядаць маральна-этычныя каштоўнасці, дадзеныя чалавеку самім нараджэннем, каштоўнасці, на якіх трымаецца ўвогуле свет. З’яўляючыся вялікай таямніцаю, унікальным, непаўторным фактам, вартае ўвагі кожнае жыццё. Між тым асаблівую цікавасць выклікае, надзвычай павучальны чалавечы вопыт, што наўпрост звязаны з лёсам этнасу, нацыі, якая да таго ж з веку ў век змушана адстойваць святое права на сваё законнае месца сярод іншых народаў, „языкаў”.

Наўрад ці хлопчык з лідскіх Клімавічаў, выбіраючыся „з роднай хаты ў свет”, мог хоць цьмяна ўявіць, якія іспыты чакаюць яго за роднымі аселіцамі ў разлогах часу. Ігнаткаўская пачатковая школа, пяты, шосты клас у Скрыбаве, сёмы – у Шчучыне, урэшце навучанне ў варшаўскай гімназіі. Прыехаўшы на канікулы ў родную вёску, Янка, як і героі-студэнты ранніх апавяданняў Максіма Гарэцкага, адчувае непрыемную дыстанцыю, што спакваля ўзнікла між ім і аднавяскоўцамі:

> Аж надта выразна адчувалася тое, што не лічаць мяне зусім сваім, і што гэта не ад зайздрасці. Ніхто з іх (вяскоўцы – Г. Т.) не змяніў бы свайго лёсу на мой, каб ламаць галаву навукай, пакінуць вёску ды пхацца, як той казаў, у паны і падпанкі, а нават у папы дзеля лягчэйшага, як думалі, жыцця. Гэта лічылася ў вяскоўцаў чымсьці немаральным і сарамлівым (65).

Героі М. Гарэцкага запачаткоўваюць (разам з Андрэем Лабановічам з рамана „На ростанях” Якуба Коласа) шэрагі інтэлігентаў у першым пакаленні, якім мус паяднаць у сабе асвету, расхінутасць у вялікі свет з роднымі каранямі. Гімназіст Янка вырашае гэтую праблему ўжо напрыканцы 30-х гадоў. Заходнебеларуская вёска, апынуўшыся за межамі Беларусі, у значнай ступені жыве сярод праблем пачатку XX стагоддзя, без асаблівых перамен. Ды на зямным падворку ўжо трагічны 1939 год. Першага верасня распачынаецца другая сусветная вайна, якая сталася для беларусаў не толькі Вялікай Айчыннай, але і ў значнай ступені Грамадзянскай вайной.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki” Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

Натуральна, узброенае супраціўленне агульнаму ворагу ў паядынку сусветнага зла з дабром насіла характар нацыянальна-вызваленчай барацьбы. але кожны народ і кожная дзяржава ўдзельнічалі ў ёй адпаведна свайму геапалітычнаму становішчу і нацыянальным своеасаблівасцям. Уніфікацыя ў ацэнцы працэсаў, што адбываліся на тэрыторыях нацыянальных рэспублік Савецкага Саюза, была выразным вынікам несумленных палітычных ракіровак. Падаецца, у прыватнасці, слушным меркаванне доктара філасофскіх навук, былога начальніка аднаго з партызанскіх штабаў Мікалая Крукоўскага:

> Разыгрывалася выпрабаваная ленінска-сталінская карта класавай барацьбы, абы не ўзнікла ідэя барацьбы нацыянальна-вызваленчай, не выкрышталізавалася беларуская ідэя, як асноўны прынцып гэтай вайны, хоць у Расіі напоўніцу ўжо выкарыстоўвалася руская ідэя, няхай яна так тады і не называлася. Баяліся, каб не паўтарылася тое, што разгортвалася на Украіне і ў прыбалтыйскіх рэспубліках. У той жа час не хацелася прызнаваць фактычную грамадзянскую вайну ажно на трыццатым годзе пасля „перамоганоснага Кастрычніка", калі згодна сталінскай канстытуцыі к 1936 году асновы сацыялізму былі быццам бы пабудаваны[3].

Менавіта гэтымі аспектамі вытлумачваецца „доўгая і непрыгожая валтузня", напрыклад, вакол партызанскай тэмы ў друку і літаратуры. Нацыянальна-вызваленчы рух настойліва імкнуліся паказаць як „усенародную дапамогу" партыі і органам НКУС у барацьбе супраць „здраднікаў". Аднак узнікала небяспечнае пытанне адносна паходжання такой колькасці „здраднікаў". Таму праводзілася паслядоўная палітыка ўтойвання злачынных рэпрэсій, дзікунскага шабашу, гвалту, учыненага ў перадваенныя гады над сялянствам і нацыянальнай інтэлігенцыяй. Больш таго, амаль да сярэдзіны 50-х гадоў працавала карная машына, пад калёсы якой траплялі не проста ні ў чым не вінаватыя людзі, а вельмі часта – героі, пакутнікі, гонар нацыі.

Недзе перад самым пачаткам вайны з Варшавы на імя Івана Жамойціна прыйшоў ліст, у якім паведамлялася, што – і гэта нягледзячы на паспяховае завяршэнне навучальнага года – яго сын выключаны з праваслаўнага мітрапольнага інтэрната. Дадзенае рашэнне, як падкрэслівалася, было канчатковым і не падлягала перагляду. Прычыны?

> Разважаючы тую нітку прыгадак, я прыпомніў яшчэ і той факт, што адміністрацыйны сакратар інтэрната, нейкі Вішнеўскі,ураднік назначаны

---

[3] М. Крукоўскі, *„Партызаны, партызаны – беларускія сыны". Урокі беларускага супраціўлення*, [у:] „Літаратура і мастацтва", 1994, 24 чэрв.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

> Міністэрствам веравызнанняў і адукацыі, паклікаў мяне аднойчы і разам са сваім памочнікам распытваў пра маю сям'ю, пра мову, якой карыстаюся дома. Пытанні былі таксама пра сястру, чаму яна вучылася ў беларускай, а не польскай гімназіі, і г.д. Хоць на іхнія пытанні я адказваў шчыра, то ўсё ж з іхняга боку напаткаў нейкія крытычныя заўвагі ці папрокі, якія давялі мяне да плачу (66).

Нечаканая вестка надта балюча выцяла бацьку, які ўскладаў вялікія надзеі на сынава навучанне і высільваўся як мог з грашыма, бо сын „здабыўшы адукацыю, павінен быў рэкампенсаваць перажыванні бацькам і малодшаму сямейству, памагаючы яму выйсці ў свет з даўно ўжо зацеснай гаспадаркі" (67). Сын жа перажываў падвойна – за крушэнне надзей і бацькавых, і сваіх. Аднак калі неўзабаве ў гімназіі Караля Хадкевіча, ўжо ў Лідзе, будуць праводзіць анкету, хто якой нацыянальнасці, у класе афіцыйна беларусам запішацца толькі Янка ды яшчэ адна дзяўчына. „Іншыя вучні, хоць з чыста беларускімі прозвішчамі, назвалі сябе палякамі. Яўрэйскія дзеці таксама запісвалі сябе палякамі. Некаторыя казалі, што мусяць папытаць бацькоў" (69). І не прыходзіцца здзіўляцца, што, апынуўшыся на матуральным курсе ў Наваградку, стаўшым падчас вайны сапраўднай вучнёўскай маладзёжнай сталіцай, Янка Жамойцін акажацца ў самай гушчы беларускага нацыянальнага руху. Выдзеліць яго з гурту матурантаў нацыянальна ўсвядомлены настаўнік Барыс Рагуля і павядзе аднойчы шчырую гаворку:

> Падкрэсліўшы складанасць сітуацыі, у якой апынулася Беларусь, стараўся ён пераканаць мяне ў неабходнасці і шанцах аб'яднання свядомых беларусаў дзеля падрыхтоўкі да немінучай барацьбы за вызваленне Краіны. Звярнуў ён увагу на небяспеку кожнай беларускай нацыянальна-адраджэнскай дзейнасці, як з боку немцаў, так і савецкіх ды польскіх партызан. Палажыў націск на ўсведамленне як найшырэйшых кругоў беларускага грамадства, асабліва моладзі. Запрапанаваў разважыць справу да наступнага спаткання (84).

Чарговая гутарка пасля ўрокаў у апусцелай школе закончыцца для юнака Янкі Жамойціна лёсаносным рашэннем. Удзел у арганізацыі, мэтай якой ёсць барацьба за свабоду і суверэнітэт Беларусі, мог быць толькі добраахвотным. Кожны прымаў рашэнне сам.

> „Калі ты пагаджаешся, прысягаць будзеш перад Пагоняй, як сімвалам Беларускай дзяржавы", – на гэтыя словы я ўстаў без вагання, глянуў на выяву Пагоні на сцяне класнага памяшкання, падсветленую слабенькім святлом з вакна, ці то ад электрычнай лямпы на слупе, ці ад водбліску месяца ў марозны вечар. У галаве мільганула думка, што надышоў момант, які можа мець рашучае значэнне не толькі для майго лёсу (85).



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

У траўні 1943 года Янка Жамойцін быў прызначаны кіраўніком Саюза Беларускай Моладзі, у задачы якога ўваходзіла ахаванне арганізацыі ад уплыву акупантаў, забеспячэнне ідэалагічнай працы з моладдзю, развіццё культурна-асветнай дзейнасці і ўмацаванне перакакання, „што галоўны абавязак гэта служба свайму беларускаму Народу і Бацькаўшчыне, а не якому-колечы «вызваліцелю», тым больш – яўнаму акупанту" (87). Гісторыя, аднак, і гэтым разам не спрыяла беларусам у ажыццяўленні высакародных памкненняў адраджэння слаўных традыцый дзяржавы, што ў сутарэннях часу мела сваю разгалінаваную гісторыю з развітай пісьмовасцю, дасканалымі юрыдычнымі дакументамі. Зноў цынічна, эксплуатаваліся непасрэдна беларускія інтарэсы, служылі сродкам дасягнення мэт іншым народам. Радзіма тым часам нараджала, узгадоўвала патрыётаў, моладзь, якая не ўяўляла сваё жыццё па-за служэннем беларушчыне. Слушна разважае Людміла Сінькова:

> Сапраўды, ва ўсёй грамадскай чыннасці Я. Жамойціна і ў тым светапоглядзе, што адлюстраваны ва ўспамінах „З перажытага", выразна дамінуе менавіта беларушчына. Прычым успаміны напісаны так, што спецыяльныя патрыятычныя інвектывы ў іх нават асабліва не запатрабаваныя, таму што абсалютна ўсе жыццёвыя факты – у такім асвятленні, у якім яны выкладзеныя Я. Жамойціным – ужо арганізаваныя, прадвызначаныя ягонай нацыянальна-патрыятычнай пазіцыяй. У споведзі „З перажытага" мы найперш бачым юнака, чалавека, кінутага ў вір вялікай гістарычнай трагедыі. На ягоныя самыя запаветныя і высакародныя памкненні, сутнасцю якіх ёсць патрыятызм, падае цень чужацкай апекі, і пра гэта Янка Жамойцін піша менавіта „знутры" жыццёвай сітуацыі, праз псіхалагічную праўду фактаў. Мы нібы адчуваем перажыванні хлопца, які мае душу, сэрца, розум, сілы, якому трэба атрымліваць адукацыю і працаваць – і ведаць, дзеля чаго; і непазбежна рабіць свой выбар паміж спраўджанасцю і дэзерцірствам, адказнасцю і эскейпізмам, паміж „быць" альбо „не быць" менавіта ў тых варунках, якія безальтэрнатыўна прапануюцца беларускім фатальным лёсам[4].

Напоўніцу зведаў „беларускі фатальны лёс" юнак з Клімавіч. Ужо 22 снежня 1949 года, як муж і жонка Генюшы ў Празе, ён быў схоплены па дарозе дадому ў польскім Пшэворску, а праз пару месяцаў апынуўся ў мінскай „амерыканцы". Трэба было абвінаваціць яго ў чымсьці асабліва шкодным, найлепш у дыверсіі ці шпіянажы, згодна з пануючай тады шпіёнаманіяй. За час следства Янка Жамойцін праходзіць праз свае

[4] Л. Сінькова, *Чалавек і гісторыя ў мемуарах Янкі Жамойціна*, [у:] „Тэрмапілы" 2003, № 7, с. 108.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

незабывальныя пякельныя кругі. Вось фрагмент уражанняў, вынесеных ім са знаходжання ў карцэры:

> Холад з сырасцю пранікаюць маментальна праз бялізну, пранізваюць усё цела, выклікаючы нястрымліванае дрыжэнне. Гэта змушае нешчасліўца да безупыннанага руху ажно да поўнага расходавання фізічнай сілы. Раніцай дастаўляюць у карцэр па кружцы ледзь цёплай вады, якую называюць кіпятком. Цераз дзень да вады дадаюць кусочак хлеба. Сілы пакідаюць ў такіх абставінах вельмі хутка. Свядомасць безабароннасці перад так прыдуманым працэсам знішчэння чалавека і бязвыхаднасць становішча ў пэўным моманце выклікаюць назойлівую прагу смерці, як адзінай магчымасці вызвалення ад наносімых пакутаў, прыніжэння і бесперспектыўнай вегетацыі. Паяўляецца тады быццам апошняя надзея – думка малітвы (146–147).

Пракурор на судзе запатрабаваў „для неисправимого врага советского народа и государства" вышэйшай меры пакарання, якая, аднак, была „літасціва" заменена судом на 25 гадоў зняволення ў „особых исправительно-трудовых лагерях" і на пяць гадоў пазбаўлення грамадзянскіх правоў.

У хуткім часе разам з іншымі вязнямі Янка Жамойцін быў адпраўлены па этапу да месца зняволення. Вопыт падарожжа ад турмы да турмы займае ў аповесці менш, чым дзве старонкі, а мог бы скласці цэлы твор. Лаканічным стылем выкладаюцца ў аповесці ўвогуле многія падзеі, факты, нібы аўтар, перанасычаны жыццёвай матэрыяй, амаль з пяцідзесяцігадовай дыстанцыі спяшаецца агледзець сваё мінулае ў цэласнай перспектыве. Досыць доўга давялося чакаць чытачу гэтую аповесць. Так, пісаць па свежых слядах, знаходзячыся ў цэнтры жыццёвых працэсаў, калі яны не ахопліваюцца цалкам, выклікаюць самыя разнастайныя эмоцыі, згодна псіхалогіі творчасці, вельмі цяжка. Тым больш, калі гаворка ідзе аб жыццёва важным, сутнасным. Ды яшчэ аб тым, што да апошняга часу, як вынік парадаксальнасці беларускай гісторыі, атрымлівае супрацьлеглыя ацэнкі.

У лютым 1951 года герой аповесці „З перажытага" аказаўся ў лагеры на ўскраіне Караганды. „Усе мы ператварыліся ў шэрую безназоўную масу – рабочую сілу – тавар, адзінкі якога пазначаны дзеля рацыянальнага выкарыстання" (155). Пазначаныя лічбамі і літарамі, кантраляваныя безупынна ў лагеры і на рабоце, заўсёды галодныя, прыніжаемыя – як ў такіх нялюдскіх умовах захаваць сваю чалавечую існасць... Кожны дзень праходзіў „ва ўмовах жорсткага абсалютнага фізічнага і маральнага прыгону" (155), вытрымаць які, пэўна ж, маглі далёка не ўсе. І пад восень 1952-га Я. Жамойцін апынаецца пасярод казахстан-



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

скага стэпу ў інвалідным лагеры ў Спаску, вядомым сярод вязняў як „душагубка”. Ды, на шчасце, разам з вясною наступнага года са „смерцю тырана” прыйшла ўсеагульная палёгка. А пазней, у жніўні 1956-га Я. Жамойцін быў апраўданы і вызвалены. Справядлівасць перамагла. Але як дорага давялося за яе заплаціць!

> Здаўленае пачуццё эйфарыі, выкліканае на момант свядомасцю асабістай вольнасці, нечакана ўступіла рэфлексіі, якая насоўвала натоўп пытанняў без адказу. Колькім сотням тысяч такіх як я ўдалося мінуцца з жаданай для іх пракурорамі шыбеніцай, перанесці цярпенні і здзекі следства, голаду і паднявольнай працы, патраціць гады маладосці, каб пачуць у канцы, што ўсё гэта адбылося без іх віны, ды наогул вінаватых у гэтых недарэчнасцях быццам бы і не аказалася? А колькіх не мінула незаслужаная смерць з рук катаў? (168)

Каму адрасаваць гэтыя пытанні?! Чаму сістэматычна ўзнікаюць сацыяльна-палітычныя варункі, пры якіх чалавек прыніжаецца, нішчыцца... З горыччу піша Я. Жамойцін пра „комплексы зняволення”, з якой цяжкасцю давялося іх пераадольваць і ўрэшце канстатаваць, што падсвядомасці з мінулымі кашмарамі ў снах не размінуцца... Годна вытрымаў, аднак, Я. Жамойцін усе іспыты, вызначаныя яму. Прайшоў праз пакуты з хрысціянскай цярплівасцю і прыняў свой лёс як дадзенасць, непазбежнасць:

> Мушу, аднак, з цэлай упэўненасцю заявіць, што ніколі не непакоіла мяне пачуццё раскаяння ці жалю з прычыны пражытага. Наадварот, калі паяўляецца сумненне, то перад усім у тым сэнсе, ці дастаткова сумленна выконваліся прынятыя на сябе грамадскія, хай сабе не так ужо і вялікія абавязкі (170).

Пад „Пагоняю”, спаконным беларускім гербам з выявою вершніка, правобразам якому Георгій-пераможца, які папірае сваёй дзідай змея-спакушальніка, прысягнуў матурант Янка Жамойцін як на вернасць Айчыне, так адначасова і на вернасць дару жыцця. Глыбока сімвалічна, што адбылося гэта ў першай сталіцы Вялікага княства Літоўскага, у старадаўнім Наваградку, герб якога „Пагоня” і стаўся сімвалам новаўтворанай дзяржавы. Бацькоў, родную зямлю, нацыянальнасць, веравызнанне не выбіраюць. Прынамсі, інтэлектуальныя пошукі ў гэтай сферы паграводжаюць разбурэннем, анамаліямі духоўнага кшталту. Змест аповесці „З пражытага” складае жыццёвы шлях чалавека, які акумуліраваў у сабе маральна-этычныя вартасці, каштоўнасці, напрацаваныя тысячагадовай гісторыяй беларускага этнасу, упісанага ў агульны кантэкст развіцця хрысціянскай цывілізацыі.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki” Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

Нядаўна, якраз напярэдадні праваслаўнага Вялікадня, 25 красавіка 2003 года ў дарозе на родную Лідчыну сэрца Янкі Жамойціна спынілася. Пэўна, мог бы ён яшчэ шмат расказаць аб перажытым, сведчаннем чаго найперш яго апавяданне „Лёсы іх сышліся ў Спаску", пабачыўшае свет у часопісе „Тэрмапілы"[5]. Аднак фрагмент жыцця, асаджаны Янкам Жамойціным на старонкі аўтабіяграфічнай аповесці, цэласная мадэль складанай беларускай рэчаіснасці жыве ўжо па законах мастацкай праўды і актыўна працуе на беларушчыну[6].

---

[5] Тэрмапілы 2002, № 6, с. 98–111.

[6] Выданне *Беларускія пісьменнікі Польшчы*, Мінск 2000, адкрываецца аповесцю Янкі Жамойціна *З перажытага*.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021